УДК (08)27(476)

# ПАЛІТЫКА ЭКУМЕНІЗМУ ІІ ВАТЫКАНСКАГА САБОРА І КАНЦЭПЦЫЯ “РАЗЛОМУ ПАМІЖ УСХОДАМ І ЗАХАДАМ” ТАМАША ПАДЗЯВЫ

***канд. філас. навук, доц. Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск)***

*Разглядаецца ўзаемаўплывы усходняй і заходняй цывілізацыйных плыняў у творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў. Адзначаецца, што дадзеная тэма з’яўлялася актуальнай для айчынных мысліцеляў. Атрымаўшы першы імпульс у праграмным творы І. Абдзіраловіча “Адвечным шляхам”, яна працягвала развівацца ў межах творчай спадчыны прадстаўнікоў каталіцкай філасофіі на Беларусі. Аднachасова дадзены кірунак звязаны з дзвюма асаблівасцямі: па-першае, тэма ўзаемаўплываў увасобілася ў рэдуцыраваным выглядзе – у тэме ўніі, па-другое, тэарэтычнае асэнсаванне такой ідэалагічнай з’явы як экуменізм, амаль не закранаrange беларускімі аўтарамі. Вылучаецца з гэтага шэрагу постаць а. Тамаша Падзявы, які на старонках польскага часопіса “Знак” здолеў прадставіць арыгінальную канцэпцыю “разлому паміж Усходам і Захадам” на падставе адрознення паміж крыніцамі паходжання і асноўнымі ідэямі светапогляду двух уплывовых тыпаў культур.*

***Ключавыя словы**: беларуская думка, каталіцкая філасофія, усходняя і заходняя традыцыі хрысціянства, усходні вектар палітыкі Ватыкана, філасофія на мяжы, Тамаш Падзява.*

Мэта дадзенага артыкула – даследаванне спецыфікі ўвасаблення ідэй палітыкі экуменізму, сфармуляваных падчас працы ІІ Ватыканскага Сабору, у творчасці прадстаўніка каталіцкага кірунку рэлігійнай філасофіі на Беларусі – а.Тамаша Падзявы. Актуальнасць пазначанай тэмы абумоўлена некалькімі фактарамі. Цяжка недааацаніць унёсак Ватыкана ў паляпшэнне стасункаў паміж краінамі сацыялістычнага лагера і краінамі Захаду. Таксама для шматлікіх прадстаўнікоў каталіцкай царквы, якія нягледзячы на рэпрэсіўныя захады, працягвалі адстойваць свае права на рэлігійную прыналежнасць, гэты фактар быў адчувальнай падтрымкай і доказам неабходнасці барацьбы за свае правы.

Натуральна, што сярод айчынных інтэлектуалаў назіраецца інтарэс да ўзаемадзеяння ўсходняй і заходняй традыцый хрысціянства. Алюстравалася ў асноўным дадзеная праблематыка ў напрамку распрацоўкі ідэі ўніі ў якасці нацыянальнай рэлігіі, якая можа передолець тыя супярэчнасці, якія ўзніклі перад беларусамі: найбольш складаныя з іх былі абумоўлены адначасовай наяўнасцю артадаксальнай і рыма-каталіцкай плыняў хрысціянства, а ў культурным плане – цывілізацыйнымі ўплывамі Усходу і Захаду.

Праблематызаваў памянёны аспект на тэарэтычным узроўні ў творчасці, указваючы на відавочныя супярэчнасці, упершыню І. Абдзіраловіч, адзначаючы наступнае: “Ваганьне паміж Захадам і Ўсходам і шчырая няпрыхільнасьць ні да аднаго, ні да другога зьяўляецца асноўнаю адзнакаю гісторыі беларускага народу. Прыклад Скарыны, аб якім да гэтай пары няведама, хто ён быў такі, ці каталік, ці праваслаўны, і пэўна, што і той і другі разам, адбівае гэтае зьявішча беларускага духу ў індывідуальнасьці, ў душы нашага першага інтэлігэнта. Гэтую рысу беларуская народная інтэлігэнцыя захавала і да нашай пары, але, як бачым, на тое ёсьць гістарычныя прычыны” [1, с. 9]. Работу І. Абдзіраловіча “Адвечным шляхам” прынята лічыць пачаткам асэнсавання дваістасці гістарычных шляхоў беларускай нацыі. Зразумела, што прадстаўнікі рэлігійнай плыні філасофіі на Беларусі спрабавалі вырашыць дадзенае пытанне ў межах хрысціянскай каштоўнаснай сістэмы. Гэтым і можа быць абумоўлены інтарэс да ідэі рэстаўрацыі ўніі як на украінскіх, так і на беларускіх землях. У асноўным асэнсаванне ўніі, як ужо пазначалася, адлюстравалася ў творчасці беларускіх аўтараў у практычным кірунку з яскравым апалагетычным адценнем. У якасці прыкладу тут можна прывесці працы Л. Гарошкі, А. Станкевіча, В. Шутовіча і інш. У якасці праграмнага твору, прысвечанага дадзенай праблематыцы, варта ўзгадаць “Пад знакам “рускае” і “польскае” веры” Л. Гарошкі [2]. Аднак на тэарэтычным узроўні асэнсаванне праблемы цывілізацыйных уплываў Усходу і Захаду на старонках “Хрысціянскай думкі”, Зніча” і “Божым шляхам” прадстаўлена толькі ў артыкуле П. Задумы (крыптонім Пятра Татарыновіча) “Нашае палажэнне – нашыя мэты” [5]. Рэфлексуючы над праблемай Усход-Захад, аўтар адзначае: “Калі-б хто хацеў трапна назваць як культурна-нацыянальнае, так і геапалітычнае палажэньне нашага народу, дык хіба не знойдзе для гэтага больш адпаведнага тэрміну, як вось гэты: на скрыжаваньні. На гэтым крыжаваньні розных дарогаў, інтарэсаў і ўплываў суджана было нашаму народу збудаваць сабе сялібу. З поўначы ваяўнічая Балта-Скандынавія, а з паўдня багатае старакультурнае Грэцка-Рымскае Міжзімнамор’е, з захаду Германа-Польскі, а з усходу Эўразійска-Расейскі экспансыўны свет. Наколькі з аднаго боку гэткае палажэньне давала народу культурна-гандлёвыя магчымасьці, як той

гістарычны шлях “з Вараг у Грэкі”, натолькі з другога гэтае-ж палажэньне выстаўляла край на сьмяротныя небясьпекі. У нашых часох гэтыя небясьпекі выраслі да жахлівых разьмераў” [5, с. 1].

Такім чынам, можна адзначыць першую асаблівасць, уласцівую для напрамку рэфлексіі беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў: тэма напружанага дыялогу паміж заходняй і ўсходняй цывілізацыйнымі плынямі была для дадзеных аўтараў актуальнай, але ўвасобілася яна ў рэдуцыраваным выглядзе – у тэме ўніі.

Трэба адзначыць, што “усходні кірунак” палітыкі Ватыкана амаль не кранаўся ў творчасці беларускіх аўтараў. Гэта можа быць патлумачана тым, што большасць дадзеных аўтараў у перыяд II Ватыканскага Сабору знаходзілася ў эміграцыі і лічыла больш важкімі праблемы захавання каштоўнасцяў беларускай нацыі, а таксама захавання самаго касцёлу перад небяспекай ваяўнічага атэізму. Лагічна, каб у сувязі з дадзенымі праблемамі, “усходняя палітыка” Ватыкана павінна была ўвайсці ў праблемнае поле рэфлексіі беларускіх каталіцкіх аўтараў, але такога не адбылося. І ў гэтым заключаецца другая асаблівасць успрыняцця вышэйпазначанай праблематыкі ў творчасці беларускіх мысліцеляў.

Адзіным аўтарам, які выпадае з дадзенага напрамку, з’яўляецца Тамаш Падзява, які прысвяціў вялікую частку сваёй творчай працы тэарэтычнаму асэнсаванню рэлігійных і філасофскіх аспектаў уздзеяння ўсходняй візантыйскай традыцыі, а таксама вызначэнню яе асноўных адрозненняў ад рымакаталіцкай. У святле вышэйпазначанага даследаванне творчасці Т. Падзявы мае безумоўную актуальнасць і патрабуе пільнага вывучэння.

Карані ўзнікнення палітыкі экуменізму трэба шукаць у дзейнасці II Ватыканскага Сабору (1962–1965). Як вядома, асноўнай яго мэтай была спроба абнаўлення і рэарганізацыі дагматычнага вучэння, а таксама палітыкі рыма-каталіцкай царквы, а самі прынятыя рашэнні ўвайшлі ў гісторыю пад назвай Аджарнамента. Сярод асноўных пытанняў, якія закраналіся напрацягу дзейнасці Сабору (праблема збаўлення, культ марыйны, абнаўленне літургіі і г.д.), быў сфармуляваны накірунак экуменізму – руху за пераадоленне супярэчнасцей паміж рознымі хрысціянскімі царквамі. Сутнасць і асноўная ідэя экуменізму можа быць прадстаўлена адным выразам, які набыў вялікую папулярнасць пасля заканчэння Сабора: Ut omnem unum sint (абы ўсё сталася адным). Таксама трэба адзначыць, што канцэпт экуменізму атрымаў шырокую падтрымку сярод усіх дэлегатаў Сабору: так за прыняцце схемы ўвасаблення дадзенай ідэі 2137 удзельнікаў прагаласавала “за” і толькі 11 “супраць” [11, с. 10].

У выніку быў прыняты дэкрэт, ва ўводзінах якога падкрэслівалася неабходнасць узмацнення высілкаў для навяртання еднасці сярод усіх хрысціян як адной з галоўных мэт II Ватыканскага Сабора [11, s. 10]. У дакуменце падкрэслівалася, што Хрыстос заснаваў адзіны і агульны для ўсіх Касцёл, але насуперак гэтаму ў сучасным свеце існуе мноства розных адгалінаванняў, якія сцвярджаюць, што кожнае з іх з’яўляецца сапраўдным спаткаемцам Хрыста. Гэты падзел відавочна ідзе насуперак яго волі [11, s. 10]. Сярод іншага прапаноўвалася замяніць ужыванне такіх слоў як “схізматыкі” і “еретыкі” на “братоў адлучаных” (Fratres Separati), а таксама прапаноўвалася падчас дыскусій аб вяртанні вернікаў да лона каталіцкай царквы замяняць канцэпт “навяртанне”, які падкрэслівае памылковасць папярэдняга веравызнання, на больш нейтральны “паяднанне” [11, s. 164]. Таксама падкрэслівалася, што каталіцкая царква павінна першай зрабіць крок насустрач прадстаўнікам іншых веравызнанняў [11, s. 165].

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што ідэі паяднання існавалі па-за ўнійным праблемным полем і да II Ватыканскага Сабору, напрыклад, у рабоце “Свет с Востока: взгляд на католическое Православие сравнительно с Папством и Протестантизмом” артыкулююцца праграмныя ўстаноўкі падобнага кшталту: “Пасля таго, як Папа адарваў Заходнюю Царкву ад Усходняй, Усходняя Царква, згодна сведчанням гісторыі, захавала каталіцкае вучэнне, якое было адзіным і нязменным да сённяшняга часу і чакае з нецярпеннем уз’яднання ўсёй хрысціянскай царквы” [9, с. II].

Ідэалогія экуменізму пачала імкліва пашырацца ў межах касцёла пасля II Ватыканскага Сабору. Практычнае ўвасабленне яна атрымала ў фарміраванні так званага “ўсходняга вектара” Ватыкана.

Дадзены факт шырока адлюстраваны ў межах даследаванняў савецкіх аўтараў. Так, напрыклад, наяўнасць дыялогу адзначае даследчыца В.П. Мазалава: “У паслясаборны перыяд сфарміравалася форма дыялогу, у чым была вялікая заслуга дзяржаўнага сакратара Ватыкана, якога яшчэ называюць “архітэктарам” “усходняй палітыкі”, Агасціна Казаролі. Ён праводзіў паслядоўную лінію па замацаванню пазіцый каталіцкай царквы ў сацыялістычных краінах шляхам дасягнення пэўных дамоўленасцяў з іх урадамі. І трэба адзначыць, палітыкай “невялікіх крокаў” дасягнуў некаторых вынікаў, якія адлюстраваліся ў стабільных узаемаадносінах паміж каталіцкай царквою і сацыялістычнымі краінамі. Дзейнасць Казаролі была цалкам санкцыянавана Паўлам VI” [8, с. 7].

Асноўную мэту “ўсходняга кірунку” палітыкі Ватыкана можна ахарактарызаваць як імкненне стварыць ідэалагічныя перадумовы для паспяховага распаўсюджвання каталіцызму ў рэгіёнах, дзе ён, у сілу гістарычных абставін, каранёў не меў, а таксама ўзмацніць уплыў на тэрыторыях, дзе ён ужо быў значна саслабелы. На афіцыйным узроўні гэта знайшло адлюстраванне ў некаторых энцыкліках, выдад-

зеных папскім прастолам. Сярод іншых трэба ўзгадаць “Slavorum Apostoli”, дзе артыкулюецца ідэя пераадолення расколу паміж заходняй і ўсходняй царквамі [12], а таксама “Euntus in mundum”, прысвечанай тысячегоддзю хрышчэння Русі [6].

Адначасова трэба адзначыць, што дадзеныя словы аб паспяховым узаемадзеянні Ватыкана і дзяржаваў сацыялістычнага лагера не зусім адпавядалі рэчаіснасці. Так, палітыка Ватыкана была фундавана непрыняццем і асуджэннем сацыялістычнай дзяржаўнасці і ідэалогіі, а таксама крытыкай марксісцка-ленінскага вучэння, адмоўным стаўленнем да тэорыі і палітыкі сацыялістычных вучэнняў, што канешне, будавала пэўныя перашкоды на шляху паразумення. Асабліва адчувальным было пагаршэнне адносін падчас Яна Паўла ІІ, які неаднаразова адмоўна выказваўся ў бок ідэалагічнага складніку краін сацыялістычнага лагера. Такую рэзкую крытыку можна патлумачыць унутранымі праблемамі каталіцкай царквы: як раз у гэты час назіраецца хваля зацікаўленасці марксісцкім метадам сярод некаторай часткі каталіцкай інтэлігенцыі.

Найбольш поўна тэма ўзаемадзеяння ўсходняй і заходняй плыняў хрысціянства ў межах творчай спадчыны прадстаўнікоў каталіцкай філасофіі XX ст. на Беларусі рэпрэзэнтавана ў творчасці а.Т. Падзявы. Сам а.Т. Падзява меў ступень доктара філасофіі (атрымаў у Папскім Грэгарыянскім універсітэце) [10, с. 8], з’яўляўся прэфектам кангрэгацыі Усходніх цэркваў [10, с. 9]. Пытанне цывілізацыйных уплываў Усходу і Захаду было цэнтральным у рэфлексіі а. Т. Падзявы, што дае падставу некаторым даследчыкам характарызаваць яго дзейнасць як “філосафа на мяжы” [3].

Артыкулы, прысвечаныя дадзенай тэматыцы, апублікаваны а. Т. Падзявам на старонках знакамітага польскага філасофскага часопіса “Знак”. Трэба таксама адзначыць, то ён – адзіны з беларускіх аўтараў, хто рэгулярна супрацоўнічаў з дадзеным выданнем. Усе работы часоў “Знака” могуць быць падзелены на дзве групы. Першы перыяд можна назваць “дасаборным”, ён прадстаўлены даследаваннямі, прысвечанымі літаратурнай спадчыне такіх вядомых рускіх творцаў як В. Розанаў і Ф. Дастаеўскі, складаецца з філасофскіх нарысаў “Дастаеўскі”, “Чалавек, які не зграшыў супраць Духа Святога” і “Ці быў Дастаеўскі філосафам?”. Нягледзячы на тое, што ў дадзеных працах яшчэ адсутнічае ў выкрышталізаваным выглядзе тэма ўзаемаўплываў Усходу і Захаду, з’яўляюцца першыя спробы яе асэнсавання. Аўтар артыкулюе ідэю аб неабходнасці фокусу не толькі на каштоўнасцях заходняй культуры, але і ўсходняй, не браць якую пад увагу, згодна яго пункту гледжання, неаб’ектыўна і памылкова: “Мы ведаем рэчаіснасць толькі такой, якой яна адлюстравалася нам у крывым люстэрку Захаду. Але мы не з’яўляемся толькі “пячорнымі людзьмі” Платона, кожнаму з нас зусім нескладана павярнуцца тварам на Усход і гэта вартае тых цяжкасцяў, якіх ад нас патрабуе. Таму што можам убачыць тое, чаго ў заходнім люстэрку ніколі не заўважым” [15, s. 1581].

У перадсаборны перыяд у творчасці аўтара ўзнікаюць першыя спробы асэнсавання артадаксальнай плыні з дапамогай метафар: а.Т. Падзява ўжывае выразы “руская душа”, “руская стыхія” [13, s. 1178], супрацьпастаўляючы яе рацыяналізму каталіцкай царквы. Надалей у другі перыяд аўтар разаўе ідэю надрацыянальнасці артадаксальнай традыцыі, адзначыўшы, што калі для рыма-каталіцкай рэлігійнай філасофіі асноватворным было пытанне ўзаемадзеяння канцэптаў вера-розум, то для праваслаўнай традыцыі кожная веда, незалежна ад яе паходжання, ужо мела сакральны характар [18, s. 1527]. Ужо ў ранні перыяд а.Т. Падзява вылучае яшчэ адну важкую рысу рускай культуры і праваслаўя “звышнатуральную шчырасць”, якая ўспрымаецца заходнім мысленнем як нешта паталагічнае [13, s. 1183]. Найбольш ярка асэнсаванне ўсходняй традыцыі і звязанай з ёй спецыфікі ментальнасці ўсходняга тыпу праяўляецца ў яго праз “метафару вады”: “душа расейская адрозніваецца ад душы заходняй культуры, як вадкае цела ад цвёрдага цела” [13, s. 1179]. Згодна з логікай аўтара, з гэтай “цякучасці” вынікае такая характэрная для руска-праваслаўнай цывілізацыі рыса, як анархія” [13, s. 1179].

У ранніх работах аўтар яшчэ не ставіць перад сабой задачы вылучыць асноўныя светапоглядныя адрозненні паміж праваслаўнай і каталіцкай традыцыямі, але ў рабоце “Дастаеўскі” ўжо з’яўляюцца першыя з канцэптаў, якімі ён будзе карыстацца параўноўваючы заходнюю і ўсходнюю традыцыі, гэта – “канечнасць” і “вольнасць” [15, s. 1584].

З 1962 года, як раз у перыяд адкрыцця ІІ Ватыканскага узмяняецца і тэматыка работ Т. Падзявы. У гэты час цэнтральнай тэмай яго рэфлексіі становіцца праблематыка ўсходне-заходніх царкоўных уплываў, прадстаўленых ў філасофскіх нарысах “Хрысціянскі Ўсход і Расія”, а таксама “Разлом паміж Усходам і Захадам”. Сфармуляваныя аўтарам высновы ствараюць цэласную сістэматычную канцэпцыю, асноўнымі аб’ектамі якой выступаюць заходні і ўсходні тыпы культуры, а прадметам – выяўленыя ім у працэсе даследавання супрацьпастаўленні. Пры гэтым высновы маюць больш песімістычны характар, чым саборны дэкрэт, прысвечаны экуменізму, прыняты ў 1965 годзе. І гэта пры тым, што а.Т. Падзяву лічуць адным з дзеячоў менавіта экуменістычнага напрамку [4, с. 15].

Звяртаючыся да канфрантацыі паміж Уходам і Захадам у дагматычным плане, ён адзначае супрацьлегласці ва ўспрыняцці канцэпта Богачалавека, праблематычнасць для праваслаўных прыняцця Папы, які мае найвышэйшую і поўную юрысдыкцыю над Рыма-Каталіцкаю Царквою як у пытаннях веры

й маралі, так і ў пытаннях дысцыпліны і кіраваньня [16, s. 207–208], у дактрынальным плане – шматпланавасць тэалагічных уплываў на Усходзе і супрацьлеглую ім маналітнасць дактрыны на Захадзе, а таксама стаўленне да праблемы вольнасці, якая ва ўсходняй культуры, паводле пункту гледжання аўтара, уласціва толькі для ўнутранага жыцця чалавека, у той час як для Захаду канцэпт "вольнасці" распаўсюджваецца таксама і на грамадскае жыццё, што змяняе ход гісторыі заходняй цывілізацыі [16, s. 213, 208.]. Для ўсходняга ладу жыцця паняцце сацыяльнай вольнасці замяняецца на дзяржаўны абсалютызм. Таксама супрацьлеглымі па сваёй сутнасці з'яўляюцца распаўсюджаныя на Захадзе і Ўсходзе ідэалагічныя плыні цэзарапапізму і папацэзарызму [17, s. 1362].

Аўтар бачыць у якасці асноватворнага пытанне крыніц фарміравання Ўсходняга хрысціянства. І згодна яго пункту гледжання яны значна адрозніваюцца ад заходняга, гэта неаплатанізм, маніхейства і гнастыцызм [17, s. 1348]. Візантыйскі містыцызм паступова становіцца падставай сваеасаблівай праваслаўнай і ў першую чаргу расійскай духоўнасці, што ў сваю чаргу вядзе да антытэзы духа і цела, дабра і зла, вольнасці і канечнасці [18, s. 1515]. Аскеза, пакута, якая для Заходняй цывілізацыі неабходная для перадолення зла і дасягнення агульнага дабра, губляе тут сваю мэту і становіцца, на думку аўтара, аскезай дзеля аскезы [18, s. 1521].

Такім чынам, у творчасці а. Тамаша Падзявы была сфармулявана канцэпцыя "разлому паміж Усходам і Захадам", у якой на падставе глыбокага тэрэтычнага аналізу была зроблена выснова аб адсутнасці ў межах тагачаснай сітуацыі пазіцый для культурнага злучэння заходняй і ўсходняй цэркваў. а.Тамаш Падзява, якога прынята разглядаць у якасці аднаго з архітэктараў палітыкі экуменізму, падкрэслівае ў сваіх творах неабсяжную бездань, што аддзяляе гэтыя дзве плыні адна ад адной. Ён упершыню ў айчыннай думцы вылучае розныя ідэалагічныя і філасофскія крыніцы фарміравання ўсходняй і заходняй рэлігійнай традыцыі, што ставіць у сваю чаргу ўжо пад сумненне саму магчымасць ідэі ut omnem unum sint. Трэба адзначыць, што ў аптымістычны час II Ватыканскага сабору, ён фармулюе стварэннем сваёй канцэпцыі перад каталіцкай інтэлектуальнай супольнасцю няёмкія пытанні, адказы на якія шукаюцца дагэтуль.

Стварэнне дадзенай канцэпцыі дазваляе, з аднаго боку аднесці Т. Падзяву да шэрагу іншых вядомых тэарэтыкаў экуменізму, а з другога – прымушае яшчэ раз пераасэнсаваць мэтазгоднасць і асноўныя ідэі палітыкі Аджарнамента і экуменізму ў межах Рыма-каталіцкага касцёла.

Па сутнасці, Т. Падзява з'яўляецца адзіным з беларускіх аўтараў, які здолеў асэнсаваць новыя павевы каталіцкага веравучэння на грунтоўным тэарэтычным пазёме, сфармуляваць глыбокую крытычную пазіцыю да новага кірунку ідэалогіі Рыма-Каталіцкай царквы. З другога боку, пытанні, якія ён паставіў перад сабой ў творчасці, так і не знайшлі адказаў у далейшым развіцці рэфлексіі аўтара ў дадзеным кірунку, застаюцца яны невырашанымі для Каталіцкай царквы і па сённяшні дзень.

ЛІТАРАТУРА


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага светагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.
2. Гарошка, Л. Пад знакам "рускае" і "польскае" веры / Л. Гарошка // Божым шляхам. – 1954. – С. 12–24.
3. Героі Беларускай Грэка-каталіцкай Царквы: ераманах Тамаш (Падзява) – святар і філосаф, які быў заўсёды на мяжы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://archive.li/4jsE9#selection-509.0-509.110. – Дата доступа: 24.04.2017.
4. Жарнасек, І. Як свечка на алтары : Тамаш Падзява. Святар, законнік (1906–1975) / І. Жарнасек // Ave Maria. – 2011. – № 4. – С. 15.
5. Задума, П. Нашае палажэнне – нашыя мэты / П. Задума // Божым шляхам. – 1947. – № 1. – С. 1–2.
6. Иоанн Павел II Euntus in mundum [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.christusimperat.org/ru/node/13476. – Дата доступа: 24.04.2017.
7. Ковальский, Н.А. Католицизм и международные отношения / Н.А. Ковальский. – М. : Междунар. отношения, 1989. – 268 с.
8. Мазалова, В.П. Католицизм – четверть века спустя после II Ватиканского собора / В.П. Мазалова. – М. : Знание, 1989. – 63 с.
9. Овербек, И.И. Свет с Востока: взгляд на католическое Православие сравнительно с Папством и Протестантизмом / И.И. Овербек. – Вильно : Изд. Вилен. православного Свято-Духов. братства, 1867. – 159 с.
10. Сіповіч, Ч. Айцец Тамаш Падзява / Ч. Сіповіч // Божым шляхам. – 1975. – № 145–146. – С. 8–10.
11. Bardecki, A. Kościól epoki dialogu / A. Bardecki. – Londyn : Katolicki ośrodek wydawniczy veritas, 1967. – 303 s.
12. John Paul II Slavorum Apostoli [Electronic resource]. – Mode of access: http://w2.vatican.va/content/john-paul-ii/en/encyclicals/documents/hf_jp-ii_enc_19850602_slavorum-apostoli.html. – Date of access: 24.04.2017.
13. Podziawo, T. Człowiek, który nie zgrzeszył przeciwko Duchowi / T. Podziawo // Znak. – 1958. – № 52. – S. 1176–1191.
14. Podziawo, T. Czy Dostojewski był filozofem? / T. Podziawo // Znak. – 1960. – № 73–74. – S. 1026–1028.

15. Podziawo, T. Dostojewski / T. Podziawo // Znak. – 1959. – № 66. – S. 1581–1609.
16. Podziawo, T. Rozłam między Wschodem i Zachodem / T. Podziawo // Znak. – 1965. – № 128–129. – S. 206–219.
17. Podziawo, T. Wschód chrześcijański i Rosja / T. Podziawo // Znak. – 1961. – № 88. – S. 1348–1369.
18. Podziawo, T. Wschód chrześcijański I Rosja / T. Podziawo // Znak. – 1961. – № 89. – S. 1515–1536.

*Поступила 17.05.2017*

## ECUMENISM POLICY OF THE SECOND VATICAN COUNCIL AND CONCEPT OF “RIFT BETWEEN EAST AND WEST” BY THOMAS PADYAVA

***G. KLIMOVICH***

*The main theme of the article is the influence of Eastern and Western civilization trends in the works of the Belarusian Catholic intellectuals. It is noted that this theme had big importance for Belarusian thinkers. After receiving the first pulse in a program work of I. Abdziralovich "By Eternal Way", it continued to develop within the creative heritage of the representatives of Catholic philosophy in Belarus. At the same time, this trend had two features: firstly, the theme was embodied in a reduced form - in the subject of the religious union, and secondly, Belarusian authors rarely touched the theoretical understanding of such phenomena as the ideology of ecumenism except Tamash Padzyava. This author on the pages of the Polish magazine "Znak" presented the original concept of the "fracture between East and West," based on the difference between the sources and the origin of the basic ideas of Christian philosophy of these two powerful types of culture.*

***Keywords:*** *Belarusian thought, Catholic philosophy, eastern and western traditions of Christianity, eastern vector of Vatican policy, the philosophy at the border, Thomas Padyava.*